*В.І.БЕЛЯКОВА*

# МЕТАДАЛОГІЯ СІСТЭМНАГА АНАЛІЗУ Ў ДАСЛЕДАВАННІ АКСІЯЛОГІІ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

Актуальнасць названай тэмы абумоўлена неабходнасцю развіцця сучасных ведаў аб аксіялогіі беларускага фальклору. У складаных і супярэчлівых сацыяльна-палітычных умовах, пры рэзкай – на ўзроўні масавай свядомасці – змене прыярытэтаў і каштоўнасных арыентацый вывучэнне фальклору накіравана на выкананне важнай гуманістычнай функцыі – раскрыццё сутнасці духоўнай культуры беларускага народа, высокіх маральных, інтэлектуальных і эстэтычных якасцей нашай культуры.

Пошук сістэмы каштоўнасцей, якая спалучала б агульначалавечыя каштоўнасці з прыярытэтамі і традыцыямі, набытымі на працягу ўсёй гісторыі існавання кожнага этнасу, – вось тая задача, што паўстала сёння перад навукай. Мастацтву, створанаму ў культурнай прасторы таго ці іншага народа, уласцівыя спецыфічныя рысы менталітэту гэтага народа, яго мастацтва адлюстроўвае сістэму каштоўнасцей менавіта дадзенага народа. Аналіз беларускага фальклору з пункту гледжання выяўлення ў ім каштоўнасных арыентацый з'яўляецца неабходным для лепшага разумення культуры нашай краіны і актуальным не толькі ў межах фалькларыстыкі, культуралогіі ці мастацтвазнаўства, але і ў агульнанавуковым плане. У айчыннай гуманітарыстыцы не існуе даследаванняў па аксіялогіі фальклору. Для вывучэння народнай вусна-паэтычнай творчасці звычайна выкарыстоўваюцца мастацказнаўчы, мовазнаўчы, культурна-гістарычны і філасофскі падыходы. Таму так істотна распрацоўваць менавіта аксіялагічны аспект вывучэння беларускага фальклору.

Сістэматызаваныя або разрозненыя звесткі пра этнічныя каштоўнасці можна знайсці амаль у любым расійскім ці беларускім этнаграфічным даследаванні, якое прысвечана традыцыйным правілам паводзін, грамадскаму жыццю ў цэлым, нацыянальнаму этыкету, нормам народнай маралі. Але асаблівасцю адзначаных работ з'яўляецца тое, што большасць з іх не абапіраюцца на колькі-небудзь распрацаваную сацыяльную ці культуралагічную канцэпцыю каштоўнасцей і таму ўяўляюць сабой больш ці менш поўны каталог сацыяльных нормаў, звычаяў, рытуалаў і іншых адзінак, якія ўскосна адлюстроўваюць каштоўнасці этнічных культур.

У айчыннай культуралогіі да нядаўняга часу пераважаў філасофскі падыход [7, с. 24], зыходным пунктам якога з'яўляецца пошук аднароднага, агульнага, тыповага ў духоўным жыцці ўсіх прадстаўнікоў чалавечага роду. Галоўная ўвага пры гэтым надаецца пазнавальнаму боку свядомасці, прычым тых яе рысаў, якія абумоўлены самой прыродай чалавека – адначасова біялагічнай і сацыяльнай істоты. На жаль, філасофскі падыход не вельмі зручны для канкрэтна-гістарычных даследаванняў. Яго абмежаванасць заключаецца ў тым, што, па-першае, не выяўляецца адметнае ў духоўным жыцці асобных краін, эпох і народаў, па-другое, эмацыянальнае жыццё чалавека разглядаецца як нешта другаснае і, па-трэцяе, з поля даследавання выпадаюць сфера бессвядомага і аспект чалавечай псіхікі, звязаны з паводзінамі.

У пэўнай ступені пераадолець гэтыя недахопы дапамагаюць сацыялагічны і псіхалагічны падыходы. Яны дазваляюць знайсці сувязь паміж рысамі чалавека і яго месцам у грамадстве, паміж свядомасцю індывіда і яго прыналежнасцю да пэўнай сацыяльнай групы, ісці ў працэсе даследавання не ад грамадства да асобы, а ад асобы да грамадства.

У той жа час сацыялагічны і псіхалагічны падыходы – не універсальныя сродкі. Даследчык не здолее з іх дапамогай, напрыклад, выявіць спецыфіку ў мысленні і паводзінах прадстаўнікоў розных эпох, соцыумаў, этнасаў, культур. Не выпадкова таму сярод гуманітарыяў узрастае колькасць прыхільнікаў "культурнай антрапалогіі", якая арыентуе на даследаванне "глыбінных структур чалавечай псіхікі, на пошук стабільных і тыповых феноменаў у свядомасці людзей, раздзеленых палітычнымі, культурнымі, этнічнымі межамі, а таксама пластамі часу" [1, с. 104]. Акрамя структуры розуму чалавека, індывідуальнага і калектыўнага бессвядомага, для разумення культуры істотна, як выглядае навакольны свет ва ўспрыманні людзей, якія належаць да розных культурна-гістарычных рэгіёнаў. Культурна-антрапалагічны падыход арыентуе даследчыкаў на выяўленне глыбінных структур чалавечай псіхікі, на пошук стабільных і тыповых феноменаў у свядомасці людзей, раздзеленых палітычнымі, культурнымі, этнічнымі межамі, а таксамі пластамі часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Істотным метадалагічным дасягненнем культурнай антрапалогіі ў рэчышчы ідэй Э.Дзюркгейма стала пераўтварэнне культурных каштоўнасных аб'ектаў у суб'екты сацыяльнага дзеяння. Народная культура – гэта спосаб захавання ідэнтычнасці і адначасова шлях пабудовы сістэмы, у якой гэта ідэнтычнасць атрымлівае каштоўнасную легітымацыю і магчымасць жыццядзейнасці на карысць сучаснага і будучых пакаленняў. Каштоўнасці, нормы і ідэалы першапачатково калектыўныя і прыўзнятыя над сферай індывідуальных інтарэсаў і патрэб. Культура кожнаму канкрэтнаму грамадству і нават грамадству ў цэлым надае сэнс, і ў гэтым заключаны адзін з самых істотных бакоў яе нарматыўных і рэгулятыўных функцый. На працягу шматвяковай гісторыі любы этнас здольны перанесці выпрабаванні і перашкоды толькі пры ўмове, што яму ўласцівы ўстойлівыя традыцыі, ідэнтычнасць і вера ў сваё прызначэнне. І, наадварот, ва ўмовах адноснага матэрыяльнага дабрабыту дэградуюць і гінуць краіны і народы, калі слабеюць іх культурныя асновы (ідэнтычнасць, мараль і інш.). Аксіялагічнае разуменне культуры як сукупнасці створаных прадуктаў, матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей дазваляе разглядаць народную мастацкую культуру як спецыфічную сацыяльную з'яву, у якой рэалізаваны сутнасныя характарыстыкі чалавека.

Пры аналізе мастацтва В.У.Селіванаў у якасці галоўнай разглядае сувязь "рэчаіснасць – мастак – мастацкі твор". Мастак успрымае інфармацыю ў акаляючай яго рэчаіснасці, праламляе яе праз свядомасць у адпаведнасці са сваім светапоглядам і адлюстоўвае ў мастацкім творы як мадэлі свету. Сутнасць мастацкай культуры выражае сувязь "мастацкі твор – публіка – рэчаіснасць". Мастацкая культура як быццам пачынаецца з успрымання і засваення твора публікай, якая сваёй ацэнкай вызначае месца гэтага твора ў грамадстве, яго далейшае жыццё. У прафесійным мастацтве творцам з'яўляецца мастак, а ў стварэнні мастацкай культуры ўдзельнічае публіка. У народнай мастацкай культуры гэтыя працэсы складаюць адно цэлае. Суб'ектам стварэння мастацтва і яго засваення з'яўляецца народ. Гэтыя працэсы непадзельныя, сінкрэтычныя, бо ў народнай мастацкай культуры няма аўтара-творцы і асобнай публікі. Стварае і спажывае, захоўвае і распаўсюджвае сам народ. Традыцыі, звычаі, рытуалы, фальклор з'яўляюцца шляхамі, спосабамі фіксацыі і трансляцыі культурнай інфармацыі і сацыяльнага вопыту і выступаюць у якасці сродкаў далучэння індывідаў да існуючых у дадзеным грамадстве каштоўнасцей. З гэтага можна зрабіць выснову, што галоўнай крыніцай пазнання традыцыйных каштоўнасцей з'яўляецца народная мастацкая культура.

Фальклор – адзін з самых ранніх тыпаў народнай мастацкай культуры [3, с. 102]. Першабытная мастацкая культура была адзінай, сацыяльна аднароднай, цэласнай. У сувязі з фарміраваннем класаў мастацкая культура падзялілася на дзве сферы: адна задавальняла патрэбы прывілеяванай часткі грамадства і пастунова пераўтварылася ў прафесійнае мастацтва, другая складалася на аснове першабытнай сінкрэтычнай культуры ўнутры земляробчай абшчыны і паклала пачатак вуснай народнай творчасці. Разнастайныя фальклорныя тэксты ўвабралі ў сябе выпрацаваныя традыцыйнай народнай культурай спосабы бачання і ацэнкі свету, тыя каштоўнасныя арыентацыі, якімі карысталася асноўная маса людзей на працягу стагоддзяў.

У заходняй навуцы першапачатково эмпірычнае вывучэнне каштоўнасцей разглядалася як прыярытэтная сфера сацыяльнай псіхалогіі (працы Дж.Альберта, М.Рокіча). У далейшым канцэпцыя каштоўнасцей пачала цікавіць і розныя культуралагічныя і псіхалагічныя школы ў антрапалогіі з пункту гледжання таго, як чалавек увасабляе ў сабе культуру пэўнага этнасу.

Расійскі даследчык А.Р.Усенка адзначае, што каштоўнасць уваходзіць у структуру менталітэту на некалькіх узроўнях:

– як уяўленне аб тым, што такое каштоўнасць і адпаведны набор "каштоўнасцей-узораў" (фундаментальных каштоўнасцей, якімі кіруюцца ўсе без выключэння члены дадзенай супольнасці);

– як сістэма каштоўнасцей – сукупнасць каштоўнасных іерархій асобных слаёў і груп грамадства, якая базіруецца на аснове фундаменальных каштоўнасцей і ўваходзіць у склад "карціны свету".

Гэтыя дзве плоскасці існавання каштоўнасцей у жыцці рэалізуюцца ў "кодэксе паводзін" чалавека, які належыць да дадзенай групы ці грамадства [7, с. 45–63]. Трэба адзначыць таксама, што, паводле прапанаванай А.Р.Усенка структуры, іерархія каштоўнасцей з'яўляецца рухомай і гнуткай, але захоўвае ў сабе і пастаянныя, канстантныя элементы. Такім чынам, можна гаварыць пра тое, што каштоўнасныя арыентацыі ўваходзяць у структурны комплекс менталітэту кожнага народа і адыгрываюць у жыцці чалавека ролю рэгулятараў паводзін і ацэнак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Духоўная культура, як і культура наогул, аб'ектыўна перш за ўсё ў тым сэнсе, што яе стэрэатыпы (катэгорыі, каштоўнасці, нормы, мадэлі), як сапраўдныя, так і несапраўдныя, з'яўляюцца ў рамках дадзенага калектыву агульназначнымі і абавязковымі – маюць у адносінах да яго прадстаўнікоў сацыяльна-прымусовую сілу. Калі дзеянне гэтай абавязковай сілы знікае ці слабее, гэта азначае, што свядомасць і паводзіны індывідаў, груп, калектываў праяўляюць сябе па-за культурай ці ва ўмовах рэзкіх і рэвалюцыйных змен у культурнай сітуацыі.

Гістарычная пераемнасць і эвалюцыя сістэмы традыцыйных каштоўнасцей у фальклоры – галоўная метадалагічная перадумова даследавання. Духоўныя з'явы, як правіла, вырастаюць з папярэдніх і трансфармуюцца ў будучыя. "Сувязь часу" дазваляе разглядаць аксіялагічныя працэсы ў гістарычнай перспектыве. «Развіццё эмпірыі, класіфікацыі і тэорыі можа ажыццяўляцца плаўна ці скачкамі ("эвалюцыя", "рэвалюцыя"); магчымы зварот да папярэдніх навуковых ідэй (поўны ці частковы); разрыў ці спыненне далейшага развіцця» [4, с. 38].

Пастаноўка, выбар і вырашэнне навуковых праблем, што ўзнікаюць як вынік раз'яднанасці, супярэчлівасці і непаўнаты навуковых ведаў, у значнай ступені абумоўлены не толькі ўласна навуковымі, але таксама і сацыяльнымі, і культурна-гістарычнымі фактарамі, уплыў якіх апасродкаваны праз сістэму метадалагічных і філасофска-светапоглядных прынцыпаў і нормаў. Таму развіццё аксіялагічных поглядаў беларусаў немагчыма разглядаць па-за рэальнымі супярэчнасцямі грамадскай сістэмы, па-за кантэкстам гістарычных умоў існавання нашага народа.

Пры аналізе агульнафальклорных з'яў адбываецца пераход ад вызначэння асаблівасцей творчага працэсу (вуснасць, варыятыўнасць, калектыўнасць, імправізацыйнасць фальклорных твораў) да разумення яго мастацкіх праяўленняў на ўзроўні жанру і асобных твораў. Даследаванне паэтыкі вусна-паэтычных твораў заснавана на прызнанні асаблівасцей структуры фальклорных твораў, сістэмы сродкаў выразнасці, іх мастацкіх функцый.

Сучасная сітуацыя ў культуры і свеце ў цэлым вымагае неабходнасць спасціжэння і асэнсавання свету ва ўсёй сукупнасці яго матэрыяльных канстант, духоўных і сацыяльна-палітычных рэалій, у супярэчлівасці глабальных працэсаў і лакальнай адасобленасці рэгіянальных культур. Ідэі і прынцыпы сістэмнага падыходу адыгрываюць вялікую ролю ў фарміраванні навуковага светапогляду і сучаснай карціны свету. Гэта карціна ў выніку навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі карэнным чынам змянілася. Усё больш настойліва ў нашу свядомасць пранікае ідэя ўзаемасувязі ўсіх з'яў і працэсаў, якія адбываюцца ў свеце, і сам свет уяўляецца як адзіны, цэласны універсум самаарганізаваных сістэм.

Да апошняга часу стратэгію навуковага пошуку складалі пераважна аналіз і падзел складанага цэлага на простыя часткі. Паступова стала зразумела, што такі падыход павінен быць дапоўнены супрацьлеглым працэсам – працэсам сінтэзу, які паказвае, як з частак узнікае цэлае. Канкрэтныя формы гэтага сінтэзу могуць быць вельмі разнастайнымі, але найбольш поўнае ўвасабленне ён атрымаў у сістэмным аналізе.

Сістэмны падыход складаецца з таго, што даследуемы аб'ект разглядаецца як цэласная, пэўным чынам арганізаваная сістэма кампанентаў, якая мае значную ступень устойлівасці. Пры гэтым уласцівасці дадзенай сістэмы як цэлага залежаць ад прыроды першапачатковых кампанентаў, іх колькасці, спосабаў сувязі і ўзаемадзеяння. Таму адно з галоўных патрабаванняў сістэмнага падыходу – аналіз унутраных сувязей аб'екта і яго будовы.

Сёння сістэмныя даследаванні ўяўляюць сабой істотную метанавуковую галіну навукі. У сусветнай літаратуры сістэмны аналіз звычайна звязваюць з імёнамі Н.Вінера, Л. фон Берталанфі, У.Р.Эшбі.

Сістэмны падыход у культуралогіі – метадалагічная аснова яе як навукі. Ён накіраваны на інтэграцыю даследчага матэрыялу, назапашанага рознымі галінамі гуманітарных ведаў, якія вывучаюць культуру (філасофія, тэорыя, псіхалогія, сацыялогія, гісторыя культуры, мастацтвазнаўства і інш.), і рэалізуе імкненне да аналізу культуры ў межах тэорыі сістэм.

Адна з першых спроб выкарыстання сістэмнага падыходу належыць Л.Уайту. У працах “Навука аб культуры” (1949), “Эвалюцыя культуры” (1959), “Паняцце культуры” (1973) і іншых ён разглядае культуру як цэласную і самарэгуляваную сістэму матэрыяльных і духоўных элементаў. Агульны закон развіцця культуры сфармуляваны ім наступным чынам: “Культура рухаецца наперад па меры таго, як узрастае колькасць энергіі на адзінку насельніцтва, ці па меры таго, як узрастае эфектыўнасць ці эканомія ў сродках кіравання энергіяй, ці тое і другое разам” [6, с. 172]. Розныя варыянты апісання культуры як сістэмы прысутнічаюць у работах Б.Маліноўскага, П.Сарокіна, Т.Парсанса і інш. Складанасць рэалізацыі сістэмнага падыходу тлумачыцца ў першую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаргу тым, что і культура ў цэлым, і самі па сабе яе асобныя кампаненты (мастацтва, этыка, рэлігія, міфалогія і інш.) уяўляюць высокаскладаныя сістэмы, і іх характарыстыкі вывучаюцца рознымі галінамі гуманітарных даследаванняў, унутры якіх, у сваю чаргу, узнікаюць школы са сваімі навуковымі “дамінантамі”.

Методыка выкарыстання сістэмнага падыходу складаецца з выяўлення неабходнага набору агульнасістэмных характарыстык, якія адрозніваюць спецыфіку дадзенай культуры (культурна-гістарычнага перыяду) ці асобных яе элементаў, і рэканструкцыі ходу і вынікаў культурных працэсаў. Гэта дазваляе прасачыць раскрыццё агульных характарыстык у культурна-гістарычнай канкрэтыцы ў адносінах да любых сфер культуры дадзенага перыяду, эпохі, этнасу і г.д. Ужо на сучасным узроўні сістэмны падыход дазваляе ўпарадкаваць ужыванне шматлікіх варыянтаў тэрміна “культура”, выпрацаваць адзіныя метадалагічная асновы для вывучэння і класіфікацыі функцый культуры.

Прычынай, якая абумовіла выкарыстанне сістэмнага аналізу ў нашым даследаванні, з'ўляецца тое, што ён накіраваны на вывучэнне як агульных, так і канкрэтных формаў праяўленняў у фальклоры заканамернасцей развіцця аксіялагічных поглядаў беларусаў. Сістэмны аналіз уключае выкарыстанне двух падыходаў да вывучэння аксіялагічнай традыцыі беларускага фальклору:

– сінхроннага, які накіраваны на раскрыццё агульнай карціны праяўлення каштоўнасцей у фальклоры як сістэме, усе элементы якой узаемаабумоўлены і звязаны;

– дыяхранічнага, які дазваляе прасачыць змены каштоўнасных арыентацый у межах пэўнага віду ці жанру фальклору.

Гістарызм мы разглядаем у якасці важнейшага прынцыпу вывучэння беларускага фальклору як зменлівай ў часе і прасторы духоўнай спадчыны народа. Усебаковаму раскрыццю даследуемай тэмы дапаможа таксама выкарыстанне класічных метадаў: гісторыка-культурнага, структурна-семіятычнага, параўнальна-гістарычнага.

“Адна з вызначальных асаблівасцей фальклору, фальклорнай творчасці, гісторыка-культурнага працэсу – гэта яго традыцыйнасць, – пісаў Б.М.Пуцілаў. – Фальклор узнікае, жыве, захоўваецца, развіваецца, змяняецца ў рамках традыцыі, якая складае яго эстэтычную і светапоглядную сутнасць. Жыццё фальклору вынікае з наяўнасці традыцыйнага асяроддзя – сацыяльнага, гістарычнага, культурнага, трываласці традыцыйнага побыту. Нярэдка пад традыцыяй маецца на ўвазе нешта коснае, адсталае, кансерватыўнае. Між тым галоўная прымета традыцыі – не коснасць, а пэўная ступень устойлівасці і абавязкова трываласць пераемных сувязей у развіцці... Любы фальклорны працэс непазбежна набывае характар руху ўнутры традыцыі, эвалюцыі традыцыі” [5, с. 183–184]. Менавіта трываласць сістэмы сродкаў выразнасці, вобразаў, сюжэтаў і матываў, тэматыкі і ідэй надае асаблівую гнасеалагічную каштоўнасць фальклорным творам.

Такім чынам, сістэмнае вывучэнне беларускага фальклору складае метадалагічную аснову нашага даследавання. Сістэмны аналіз дазваляе ахапіць усю разнастайнасць характарыстык, уласцівых традыцыйнай вусна-паэтычнай творчасці, і садзейнічае ўдасканаленню культуралогіі ў тэарэтычным і метадалагічным планах.


1. *Блауберг И.В.* Проблема целостности и системный подход. – М.: Эдиториал УРСС, 1997. – 403 с.

2. *Дюркгейм Э.* Социология. – М.: Канон, 1995. – 352 с.

3. *Михайлова Л.И.* Народная художественная культура. – М.: Вузовская книга, 2001. –264 с.

4. *Морозов А.В.* Системный анализ в историографическом исследовании фольклористики (методика и перспективы применения) // Атриум. Сер. "Филология". – 2000. – № 6. – С. 38–41.

5. *Путилов Б.Н.* Методология сравнительно-исторического изучения фольклора. – Л.: Наука, 1976. – 244 с.

6. *Уайт Л.* Избранное: эволюция культуры. – М.: Росспэн, 2004. – 1062 с.

7. *Усенко О.Г.* К определению понятия “менталитет” // Мировоззрение и самовосприятие русского общества. – М.: Изд. центр Ин-та рос. истории РАН, 1999. – Вып. 3: Российская ментальность. Методы и проблемы изучения. – С. 23–77.

8. *White L.* The Science of Culture. – N.Y., 1949. – 189 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ